И в программе Ермошина, и в выступлении Лукашенко фигурировало понижение энергоемкости и материалоемкости белорусской промышленности, неуклонный рост производительности труда и ВВП. Правда, с какой-такой стати это должно происходить, осталось загадкой. Президент говорил только про административный ресурс. Как ни странно, его должно хватить, чтобы среднегодовой темп роста ВВП составил 5,7-6,5 процента. В программе Грефа Россия замахнулась примерно на столько же, но при условии быстрого эффекта от проведенных реформ и задействовании всех имеющихся рыночных ресурсов. Для того же, чтобы Беларуси достичь таких результатов при нынешнем курсе, нужно всего лишь с помощью административного ресурса победить статистику.

Ну, а со статистикой, в отличие от экономики, у нас никогда проблем не было. То, что есть ложь, большая ложь и статистика, любой белорус знает не понаслышке, каждый день сопоставляя победные реляции власти о неуклонном повышении его жизненного уровня с реальным состоянием своего кошелька.

Напрасно Лукашенко считает, что *«все больше наших партнеров по СНГ начинают идти»* по белорусскому пути. Этого не может быть хотя бы потому, что у нас нет никакого пути, внятной стратегии развития. Мы топчемся на месте. Напрасно Лукашенко пытается заставить поверить электорат, что мысль о создании *«эффективного государства»* за ним повторил Путин (повторил на неделю раньше!). Неэффективно это, Александр Григорьевич, перетягивать рейтинг Путина на себя. Нет, вы не В. В., вы – А. Г.

ЭКСПЕРТИЗА

ВИКТОР ЧЕРНОВ (фонд *«Адкрытае грамадства»*):

Очевидно, что посланию отводилась роль еще одной пропагандистской акции в досрочно развивающейся предвыборной кампании Лукашенко. Речь президента была выдержана в обычном стиле – это и эпизодические отступления от официального текста, когда его кидало в многословные импровизации: с одной стороны, глобализм в поднимаемых проблемах, а с другой стороны, мелкотемье. Президент говорит о том, что в Беларуси развивается многопартийная система, мы стремимся к построению гражданского общества, и буквально в одном ряду с этим говорится, что в некоторых деревнях нет бань, негде помыться, где-то молоко не продают. Очень типичны для него прозвучавшие и в этот раз выпады против оппозиции, Запада и проповедь восточного панславизма. Самое главное – это постоянные противоречия, которые лишь изредка отсутствуют в его речах.

В докладе прозвучал призыв к вертикали и государственным СМИ давать отпор идеологическим противникам Беларуси, а с другой стороны, в ряду принципов, которые якобы присущи белорусской государственной идеологии, были перечислены суверенитет, признание прав человека как высшей ценности, верховенство права, закона. То есть именно то, что признают во всем цивилизованном мире и соблюдения чего требуют от Беларуси. Или противоречие между общими рассуждениями о положительной динамике развития белорусской экономики и фактами удручающего, если не катастрофического, положения в сельском хозяйстве, социальной сфере, которые также приводились в его выступлении.

На мой взгляд, ничего нового в докладе не прозвучало. Разве что можно отметить появление двух новых приоритетов в социально-экономической политике государства – привлечение инвестиций в нашу экономику и повышенное внимание к здравоохранению. Но это такие вещи, которые постоянно должны быть в числе приоритетов в любом государстве. И второй момент. Как видно из послания, президент дал добро на создание парламентских фракций. Правда, при этом он усомнился в их целесообразности, показав себя как неграмотного человека в области теории политики, политологии. Парламент без фракций просто неработоспособен, а Лукашенко предположил, что с фракциями парламент превратится в дискуссионный клуб и будет неэффективным.

В целом же этот доклад очень мало отвечает требованиям настоящего парламентского послания, потому что самые главные вопросы – законодательная работа – в докладе не были освещены. Это не случайно, поскольку парламент у нас скорее дорабатывает законы, а не разрабатывает. Разрабатывают их в администрации. Поэтому и формат послания президента напоминал скорее обычный советский доклад на партхозактиве.

ВЫБОР–2001

Народ не безмолвствует

НИКОЛАЙ РЕЧИЦКИЙ

Бездействие верхов порождает инициативу снизу. Причем зачастую именно она несет с собой наиболее свежие и перспективные идеи. Инициатива аудитории Интернет-портала *TUT.BY* по выдвижению кандидата в президенты Беларуси приобретает все более реальные черты.

Пожалуй, самым примечательным является то, что под ником *«Голас Розуму»* скрывается не амбициозный бизнесмен, не политический авантюрист или ставленник КГБ. *«Голас Розуму»* – действительно тот, за кого он себя выдает: представитель молодой интеллигенции, уставшей ждать и начавшей действовать. С этим человеком я и решил побеседовать.

– Начнем традиционно: как все зародилось, откуда пошло, у кого родилась идея? Ваша команда раньше работала вместе, или это первый опыт совместной работы?

– Началось все с общения в Интернете. Команды не было, были простые, но неравнодушные люди. Люди, которых тревожит судьба страны, которые хотят действовать, чтобы создать цивилизованное государство. В какой-то момент назрела идея выдвижения собственного кандидата. Эту роль предложили мне, я согласился. Просто посчитал, что отказаться в данной ситуации – это как-то не по-мужски. Подумал, если откажусь, если начнем искать кого-то идеального, тогда так ничего и не сможем сделать для блага страны. Нам давно хотелось хотя бы как-то действовать, принимая во внимание, что выборы уже не за горами.

– Вы представляете какие-либо традиционные политические группировки и их интересы?

– Нет. Я и команда поддержки действуем по своему усмотрению, представляем интересы простых людей, которыми и являемся. Мы не политики, в инициативную группу входят преподаватели, программист, переводчик – короче говоря, самые обычные люди. Хотя некоторые представители сегодняшних политических сил нам оказывали моральную поддержку, но не как представители какого-то конкретного движения, а как граждане. Основную работу делаем мы сами.

– Вы говорите, что у вас есть желание действовать. В чем вы видите цель этих действий?

– В этом году есть шанс создать условия для нормальной жизни. Мне этот шанс очевиден. И им нельзя не воспользоваться. Речь идет даже не о том, чтобы сменить конкретную личность – Лукашенко. Пора менять тот негатив в системе, который достался нам с советских времен.

– И каким образом вы надеетесь этого достичь? Через победу на выборах?

– Да. Не обязательно через мою победу, но я уверен, что победит демократически настроенный кандидат. Человек, не ищущий врагов, а находящий друзей.

Как и все, я хочу иметь покой в доме, достаток, веру в завтрашний день. Хочу, чтобы люди улыбались, чтобы у них был интерес к жизни. Если существующая власть этого не дает, то значит, эту власть пора менять. А раз будут выборы, нужно побеждать на выборах – это самый простой и самый законный способ.

– Допустим, сейчас 31 декабря 2001 года, выборы позади и на них... При каких условиях вы скажете, что не зря участвовали в этой кампании, даже если проиграете?

– На них Лукашенко проиграет. Вместо него должен прийти нормальный человек, умеющий признавать ошибки. А значит, все те, кто хотел этого и к этому стремился, действовали не зря. Я в том числе.

Я надеюсь, что все-таки будет создан круг сильных претендентов, и кто-то из них покажет себя наиболее проходным. Но важно не столько то, чтобы человек мог победить на выборах, сколько то, что он собирается делать потом. Мне кажется, что предвыборные программы большинства претендентов во многом схожи и все хотят, в общем-то, одного. Кто сможет победить на выборах – буду ли это я или кто-то другой – я над этим сегодня меньше всего задумываюсь, просто считаю, что каждый должен делать свое дело. Время покажет, на кого ставить.

– На какие социальные круги рассчитывает ваша команда?

– Во-первых, мы однозначно ориентируемся не только на Интернет-избирателей. Просто для нас Интернет был чем-то вроде стартовой площадки. Это одно из немногих мест, где сегодня можно высказывать свои мысли. Кроме того, Интернет позволяет собрать большую команду из разе абсолютно незнакомых людей со всей страны. Но ориентируемся мы не только на Интернет, а на всех, кто хочет жить в нормальной стране, а не в кольце врагов. Кроме того, мы ищем людей, которые хотят что-то делать для этого. Зачастую они не знают, как себя применить. Объясняем, что можно сделать.

– Например?

– Многие считают, что в связи с декретом №8 не будет наблюдателей. На самом деле наблюдатели будут, их формируют различные организации. Кроме того, наблюдателем может стать любой человек, при желании пройдясь по соседям и собрав подписи. То же касается избирательных комиссий.

И мы собираемся эту информацию донести людям. Помимо того, что мы займемся своей агитацией, мы будем собирать общую информацию о выборах и пытаться доносить ее до народа. Стараться объяснить людям, как они в рамках закона могут агитировать за того или иного кандидата. Необязательно за нас. Многие не знают, что они могут делать, а чего нет. Сейчас есть возможность это им разъяснить, многие участники нашей команды хотят эту информацию нести, и уже решено, что она обязательно будет доноситься.

– То есть, одна из ваших целей – это переход от пассивной критики власти среди населения к активной?

– Надеюсь, что это неизбежно. Чем ближе выборы, тем активней критика. Так бывает практически всегда, не думаю, что наша страна станет исключением.

Мы, в какой-то мере, собираемся заниматься образовательной, разъяснительной работой. Нести в массы информацию. Через Интернет, через какие-то прямые контакты. Просто донести до людей правдивую информацию, потому что многие ее не имеют. Я сам, к примеру, некоторых вещей не знал и узнал буквально в последние дни. Например, что человек действительно может собрать подписи своих соседей и стать членом своей участковой комиссии. Для этого нужно написать заявление, собрать подписи лиц, живущих в этом районе, и ты можешь пойти в комиссию и участвовать в ее работе, наблюдать процесс выборов изнутри. Если ты не допустил нарушений в ходе голосования, значит, по меньшей мере, на одну возможную фальсификацию меньше. Это уже плюс.

Для меня это было открытием. В частности, я и раньше пытался своих знакомых убеждать, из числа тех, которые работают в госструктурах, в младшем звене, и которым предлагают идти в комиссии... Народ отказывается, потому что не хочет участвовать в этом фарсе. Я говорил им: «Действуйте честно, и вы не будете ни в каких грязных процессах участвовать. По закону вас за это наказать не смогут. Наоборот, вас могут наказать за нарушения, но ни в коем случае не за нормальную работу». А оказывается, не только таким путем можно попасть в комиссию, но и от трудового коллектива, от группы граждан по месту жительства. Такие вещи, я считаю, нужно людям объяснять.

– И последний вопрос, который также неизбежен. Многие сегодня ждут появления «подставного» кандидата от КГБ. Это, случайно, не вы?

– (*Смеется*). Я такого кандидата не жду. ■

ПАЛІТЫЧНЫ ПАРТРЭТ

ШКЛОЎСКІЯ СТРАСЦІ

ВОЛЬГА ПАЎЛАВА

Працяг. Пачатак у №№ 7–14

ТЭРМІНУ ДАЎНАСЦІ НЕ ПАДЛЯГАЕ

Зусім не выпадкова я ўзяла гэтую назву. Бо па віне Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі дыскрэдытуецца тытул прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Спадзяюся, што ён сам зацікаўлены ў тым, каб расставіць правільныя акцэнты ў гісторыі з аўтамабілямі. Так, так, двума аўтамабілямі – ЗІЛ з прычэпам і ВАЗ-2121 «Ніва». Таму што калі другі адкрыта раз'язджае, дзе хочацца яго гаспадарам, то лёс першага зусім вышаў з поля зроку.

Працяг пачатай у папярэднім раздзеле гісторыі з аўтамабілямі – у пратаколе пасяджэння Шклоўскага райвыканкама ад 25 мая 1993 года: «... *Передача слаўгарадскай райбальніцай аўтамабіля «Ніва» сялянскай гаспадарцы «Дыяна» зроблена незаконна. Гэтай здзелкай дзяржаве нанесены значны ўрон... Прасіць пракурора раёна С. Д. Сергамасава аказаць садзейнічанне ў вяртанні яго законнаму ўладальніку – упраўленню сельскай гаспадаркі і харчавання*».

Тады такое рашэнне мяне шчыра ўзрадвала: нарэшце, думалася, справе будзе дадзена належная прававая ацэнка. І тут, пасля публікацыі майго матэрыялу «Каму жывецца ў нас прывольна» ў раённай газеце, да мяне завітаў Лукашэнка. Ён тады яшчэ быў маім кумірам. Але, як кажуць, Платон мне сябр, а ісціна даражэй. Таму я з нецярпеннем дачакаўшыся, пакуль госць усядзецца, працягнула яму газету з публікацыяй і спыталася, гледзячы прама ў вочы:

– Якое дачыненне маеце да гэтай аферы асабіста вы, Аляксандр Рыгоравіч?

Ён раскрыў газету і, адразу ўперыўшы погляд у патрэбнае месца (відаць, ужо прачытаў), адказаў, не падымаючы галавы:

– Ніякага. Я проста пералічыў грошы ў лік устаноўленых плацяжоў саўгаса на ўтрыманне РАПА. Больш нічога не ведаю.

Я паверыла, і ў мяне адлегла ад сэрца. Падзялілася з ім патаемным напаўголаса:

– Ведаеце, я дала сабе слова адваяваць гэтую машыну ў Маліноўскага і вярнуць яе дзяржаве. Які нахабнік, а?

Аляксандр Рыгоравіч паддакнуў:

– А што, за ўсе трэба плаціць.

Цяжка было не звярнуць увагу на змяненне яго голасу. Але мала што бывае, можа, у чалавека дрэнны настрой? І я, адмёўшы гэтую дробязь, працягвала:

– Я адправіла матэрыялы на рэагаванне пракурору Сергамасаву. Чакаю адказу. А потым, калі ён памкнецца спусціць усе на тармазах, звярнуся да генеральнага пракурора.

Аляксандр Рыгоравіч уважліва паглядзеў на мяне. Вельмі ўважліва. І нечакана падняўся:

– Усё, прабач, чакаюць справы,

– і працягнуў руку для развітання. Калі за ім зачыніліся дзверы, я крыху задумалася: не такой рэакцыі чакала ад яго – разлічвала хутчэй на ўхваленне. Ён жа такі актыўны барацьбіт з карупцыяй! Але, апраўдаўшы ўсё стомай, лёгенька ўздыхнула: не, я веру гэтаму чалавеку, ён сапраўды ні ў чым не вінаваты.

Але поўнага спакою не было, не сядзелася на месцы. Паімчалася да Надзеі Андрэеўны Ермаковай, загадчыцы райфінаддзела. Балазе яна была ў кабінеце адна, што рэдка бывала. Выслухаўшы з маіх вуснаў прэзумпцыю невінаватасці Лукашэнкі, яна зайшлася ад смеху. Праз некалькі хвілін, выцершы насоўкай слёзы, запыталася:

– Няўжо вы верыце гэтаму чалавеку? Калі ён такі анёльчык, дык куды падзяваліся з саўгаснага двара машыны, трактары, якія ён з дапамогай дэпутацтва прабіў для «Гарадца»? Асабіста я ведаю пра новенькі «Беларус», які Лукашэнка па чыста сімвалічнай цане аддаў, проста прэзентаваў, бацьку Ларысы Маськовай. Магу назваць і яшчэ некалькі такіх адрасоў. А той ЗІЛ з прычэпам, пра які вы пісалі, дзе падзеўся, а? А на што пайшлі грошы, якія былі пералічаны ў саўгас «Гарадзец» для будаўніцтва пасёлка для перасяленцаў з Чарнобыльскай зоны? Ай, ёсць што гаварыць, ды няма каму слухаць, – на поўным сур'ёзе закончыла Ермакова і, махнуўшы рукой, цяжка ўздыхнула.

Я тады надта была зацыклена на машыне Маліноўскага, каб адэкватна ўспрымаць тую інфармацыю. А калі і ўспрыняла б, то, перакананая нават і цяпер, анічога б не раскапала. «Кішка тонкая», як сказаў бы, цяпер ужо мне асабіста, А. Р. Лукашэнка.

... Дні ляцелі хутка. Лета не давала падняць галавы ад прац і асноўнай, журналісцкай, працы. Тады яна давала шанец на такісякі прыжытак. Гэта цяпер усёй палучкі не хапае нават на неабходныя прадукты харчавання. Адказу ад пракурора раёна так і не дачакалася, але не губляла надзеі. Аднойчы, ідучы на работу, прама перад Домам саветаў сустрэлася з Генадзем Міхайлавічам Лаўранковым. Ён, у характэрнай для яго манеры, адразу ж задаў дзелавое пытанне:

– Ці дачакаліся рэакцыі на ваш матэрыял з афіцыйных органаў?

– Ніякай. Лукашэнка толькі заходзіў і пацвердзіў сваю невінаватасць.

– Праўда? – ажывіўся ён. І, не дачакаўшы працягу, сказаў:

– Вось і ладненька. Цяпер справу тую будзем разблытваць усе разам: з аднаго боку – Лукашэнка, з другога – вы, з трэцяга – райвыканкам. А чацвёртага каго паклічам на дапамогу, Вольга Міхайлаўна?

– Суд? – весела запыталася я.

– Які там суд! – не ва ўнісон маёй эмоцыі сур'ёзна адказаў Лаўранкоў. – Няхай вернуць машыну – і ўсё. Я, дарэчы, таксама адаслаў паперку Сергамасаву, каб той разабраўся з гэтай «Нівай». Але рэакцыі пакуль няма.

А я, ледзь пераступіўшы парог рэдакцыі, пачала тэлефанаваць у райпракуратуру самому Сергамасаву. Тактоўна выслухаўшы маю тыраду, Сяргей Дзмітравіч адказаў:

– І першае ваша пісьмо, і напамінак я атрымаў. Працу прабачыць, што затрымаліся з адказам. Усе мае работнікі ў адпачынку, і я кручуся, бы тая вавёрка ў коле. Але разумею, што вас падводжу, таму давайце дамовімся так: заўтра я прышлю вам адказ. Што? Не, не па пошце, наша сакратарка прынясе. Добра?

О, мала сказаць добра, – зусім выдатна. Але... няўжо ўсё так проста? Тады чаму цягнуў справу, быццам ката за хвост? Напэўна, вінавата я сама, не напомніла, не патэлефанавала. Начальнікі, відаць, прызвычайваліся, каб ім па сто разоў пакланіўся. Але не стала надта наракаць на начальніцкія звычкі, з нецярпеннем пачала чакаць наступнага дня. А праз дзень яшчэ патэлефанавала Сяргею Дзмітравічу: не адказаў. Я набрала нумар сакратаркі і спыталася ў яе наконт пракурора.

– Сяргей Дзмітравіч у адпачынку, – канстатавала яна і паклала трубку.

– ?!!

Задрыжаўшай рукой зноў набрала нумар пракуратуры і ледзь не крычу ў трубку:

– У якім адпачынку? Ён нічога не казаў пра яго.

– А Сяргей Дзмітравіч і не абавязаны нікога апавяшчаць пра свае планы.

– Прабачце, як ён можа ўзяць адпачынак, калі ўсе яго памочнікі таксама яшчэ адпачываюць.

– Сяргей Дзмітравіч, прабачце, пра гэта паклапаціўся. У нас усе на месцах і ўсе працуюць.

– Прабачце, а для рэдакцыі нічога не перадаваў пракурор? Ён абяцаў, што ва для вас зойдзеце.

– Упершыню пра гэта чую.

Ой, як брыдка стала на сэрцы! Што ж гэта творыцца? Дзе прафесійная этыка, дзе элементарная чалавечнасць у гэтых людзей, надзеленых уладай? Толькі не, я не скарыся. У мяне яшчэ ёсць сіла для барацьбы. І я ў той жа дзень напісала генеральнаму пракурору. І матэрыял той, з газеты, адаслала. А каб зэканоміць генпракурораўскі час, падкрэсліла патрэбныя моманты. І ўсяго праз тыдзень атрымала адказ, які змяшчаў паведамленне – абяцанне «указаць пракурору Сергамасаву С. Д. на недапушчальнасць такіх метадаў работы з насельніцтвам (чамусьці менавіта так. – Аўт.)» і што, маўляў, пракурора абавязалі адрэагаваць на запыт рэдакцыі, папярэдне правёўшы дадатковае расследаванне.

Прачытаўшы, лёгенька ўздыхнула і пацерабіла сябе за нос: а ты, дурненькая, баялася. Цяпер, нарэшце, разарвецца гэтае зачараванае кола: прафесіяналы лёгка пройдуць усе звёны злачынства. І я з надзеяй ізноў пачала чакаць паведамлення з райпракуратуры, не надта наракаючы на час. Ведала, што пры паўторным расследаванні, якое абяцалі ў Генеральнай пракуратуры, усё спатрэбіцца нямала... Пакуль раптам не пачула навіну: С. Д. Сергамасаў тэрмінова павышаны ў пасадзе і цяпер ужо ездзіць на працу са Шклова ў абласны цэнтр. Але, расхваляваўшыся спачатку, супакоілася. Маўляў, кадры мяняюцца, а справы застаюцца, таму праца над імі не спыніцца.

Спынілася. У краіне з'явіўся прэзідэнт. Генеральны пракурор Васіль Калітан пайшоў у адстаўку. Надзея Андрэеўна Ермакова ў 1994 годзе пераводзіцца з райвыканкама ў Шклоўскае аддзяленне «Аграпрамбанка» ўпраўляючай, а яшчэ праз год – у «Беларусбанк» намеснікам старшыні, а потым і старшынёй. Генадзь Міхайлавіч Лаўранкоў назначаецца старшынёй райвыканкама. Сяргей Дзмітравіч Сергамасаў – пракурорам аддзела па нагляду за следствам у органах РАУС і пракуратурах па Магілёўскай вобласці. Такім чынам, усе трое, хто ў свой час змушаны быў пракантраляваць тую здзелку з машынамі, былі цёпленька ўладкаваны Лукашэнкам. Ну як тут не ўбачыш падзяку?

Яшчэ адзін раз паспрабавала я ажывіць тую, як цяпер называю, «лукашэнкаўскую» справу. На адным з Соймаў БНФ у перапынку падышла да Пазьняка і, кораценька пераказаўшы сутнасць матэрыялаў, перадала іх Зянону Станіслававічу са словамі:

– У мяне не атрымалася давесці гэтую справу да лагічнага завяршэння, дык можа вам як дэпутату Вярхоўнага Савета будзе лягчэй.

Зянон Станіслававіч Пазьняк паклаў мае паперы – выразку з газеты, адказ з Генпракуратуры – ў правую кішэню і задумена паглядзеў на мяне.

А яшчэ ў каляндныя дні 1997 года нагадаў пра сябе сам Уладзімір Ісакавіч Маліноўскі. Тады фірма «Табея» з Германіі прывезла шклоўскай дзятве падарункі. Не абмінула тая дабрачынная хрысціянская місія і «прэзідэнцкі» садок у Рыжкавічах, як называлі яго за тое, што там працуе яго жонка. Уладзімір Маліноўскі, які стаў за гэты час прасвітарам царквы евангелістаў, суправаджаў гасцей. А мой муж, супрацоўнік райгазеты, атрымаў рэдакцыйнае заданне асвятліць у друку тую цікавую сустрэчу з дзятвой. Маліноўскі, выбраўшы зручны момант, сказаў яму:

– Перадайце вашай жонцы, што я ёй дараваў тую публікацыю у газеце і больш на яе не крыўдую.

Але і я не ў крыўдзе на Маліноўскага. Я толькі па-ранейшаму хачу ведаць механізм той «аўтамабільнай справы», яе сапраўдных герояў і хачу, каб вінаўнікі пакрылі страты, нанесеныя маёй краіне.

Працяг у наступным нумары.

ПРАБЛЕМА

Любіць чужое

АНЯ ПІЛАТОВІЧ

У беларускай сталіцы застаецца ўсё менш знешніх прыкмет беларускасці: паціху знікаюць шыльды і назвы на беларускай мове, чужыя каштоўнасці, чужыя тавары выцясняюць з ужытку ўласныя.

Горад — люстэрка жыцця і свядомасці

Гарадское асяроддзе аказвае моцны ўплыў на фарміраванне свядомасці яго жыхароў. Хаця можна сказаць і наадварот: свядомасць жыхароў аказвае моцны ўплыў на фарміраванне гарадского асяроддзя. Сённяшні Мінск – сапраўднае люстэрка нацыянальнай свядомасці. На кожным кроку дражніць вока светлавая рэклама, якая запрашае пракаціцца ў падарожжа за акіян, набыць аўтамабілі замежных фірмаў, папіць расійскае піва, з'есці гамбургер.

Уражваюць і прыпынкі грамадскага транспарту, абсталяваныя канструкцыямі з рэкламай кока-колы ці амерыканскіх цыгарэт. Каларытныя мадэлькі рэкламуюць на гіганцкіх фотаздымках прывабныя рэчы, уносяць нейкую разнастайнасць у сціплае і ўбогае жыццё беларускага грамадства. На гэтым фоне беднай сіроткай выглядае айчынная рэклама пад дэвізам «*Купляйце беларускае!*». А што менавіта беларускае рэкламуецца ў нас? Нават пра даволі прыстойныя халадзільнікі і тэлевізары чамусьці гаспадары стараюцца не распаўсюджваць. У айчынных прадпрыемстваў, загнаных сваёй дзяржавай у кут, няма нават сродкаў на рэкламу.

Затое прывідам адыходзячай эпохі, рэцыдывам мінулага часу глядзяцца двухметровыя літары старых лозунгаў на сталічных будынках: «*Подвиг народа бессмертен!*», «*Вечная слава героям!*».

Хто плаціць грошы — той заказвае музыку

Знешнім афармленнем горада вось ужо 6 гадоў займаецца дзяржаўнае прадпрыемства «Мінскгарафармленне». Яно мае сур'ёзную базу: мастацкі і сталярны цэх, аўтатранспартны ўчастак і цэх металавырабаў. Але арыентавана прадпрыемства перш за ўсё на афармленне да дзяржаўных святаў, да розных фестываляў, кангрэсаў і з'ездаў. І значна менш увагі ўдзяляецца штодзённаму афармленню Мінска і рэкламе. Тут сцвярджаюць, што ні адна рэклама і ні адна шыльда не з'явіцца ў горадзе, пакуль не атрымае адабрэнне рэкламна-мастацкага савета.

Інспектары прадпрыемства, бывае, ажыццяўляюць і дэмантаж самаробнай, малаэстэтычнай рэкламы. Але ў адносінах да замежнай рэкламы наша дзяржаўная палітыка вельмі лаяльная. Фармулюецца яна коратка і сцісла – дзяржаўнае стрымліванне. А заключаецца яно ў тым, каб не размяшчаць замежную рэкламу гандлёвых маркаў цыгарэт паблізу бальніц, дзіцячых устаноў, на цэнтральных вуліцах.

Што ж датычыцца мовы, на якой будзе змешчана рэклама, то тут выбар застаецца за заказчыкам. Дзяржаўнае заканадаўства ў галіне мовы развязала яму рукі. Пішуць, што захочацца і як захочацца. Можна не пісаць па-беларуску – не пішуць. Затое практыкуюцца па-англійску. Англійскія лагатыпы, згодна з інструкцыямі, павінны дублiравацца на дзяржаўнай мове. У нас іх двое. Выбар, як правіла, робіцца на карысць рускай.

Атрымліваецца, што заказчык выступае ў дадзенай сітуацыі галоўнай фігурай. Паводле прынцыпу: хто плаціць грошы – той заказвае музыку. Так яно, фактычна, і ёсць. Высокапрафесійныя мастакі прадпрыемства аказваюцца залежнымі ад меры густу заказчыка, якому часта не хапае элементарнай культуры. Асноўны занятак выпускнікоў мастацкай акадэміі, што працуюць тут, – рабіць аднадзёнкі, выконваць тэрміновыя работы да святаў і іншых акцый. Беларускі каларыт, стылістыка, арнаментыка, як правіла, аказваюцца непатрэбнымі ў афармленні горада.

Кіраўніцтва Мінска дало згоду на дзейнасць замежных фірм па рэкламе толькі таму, што тыя за свае сродкі ўстанаўліваюць тут тэлефонныя будкі, абсталёўваюць навесамі і лаўкамі прыпынкі грамадскага транспарту. Так што ў перспектыве разумныя замежныя прадпрымальнікі змогуць упарадкаваць і эстэтызаваць на свой лад увесь наш горад, а не толькі транспартныя прыпынкі.

Прыемная работа — рабіць свята

Як вядома, кіраўніцтва краіны, нягледзячы на ўсе палітычныя і эканамічныя казусы, паставіла задачу ў бліжэйшы час прывесці цэнтральную частку сталіцы ў першакласны парадак. Па-першае, у бліжэйшай перспектыве будзе рэканструявацца плошча Незалежнасці (тут, дарэчы, у XIX стагоддзі знаходзіўся турэмны замак), дзе збіраюцца зрабіць пешаходную зону, пабудаваць падземныя і наземныя стаянкі аўтатранспарту, бары, кафэ, рэстаранчыкі і магазінчыкі, якія будуць адкрытыя кругласутачна. Па словах спецыялістаў, абліччa Мінска ўжо да 2002 года павінна моцна змяніцца.

Цэнтральная частка – гэта, як вядома, праспекты Скарыны і Машэрава. Канцэптуальная праграма па іх афармленні прынятая ў снежні 2000 года. Згодна з гэтым планам, кожны раён сталіцы курыруе сваю тэрыторыю цэнтра. Улады шчыруюць не на жарт. Штотыднёва праводзяцца нарады з усімі юрыдычнымі асобамі – гаспадарамі жылых будынкаў, кафэ, магазінаў, офісаў наконт знешняга афармлення і інтэр'ераў памяшканняў. Дарэчы, дазвол на афармільцкія работы будзе даваць Камітэт па архітэктуры толькі пры наяўнасці так званага пашпарта рэкламы. Кожны эскіз праекта будзе абмяркоўвацца калегіяльна, на рэкламна-мастацкім Савеце. Кантроль за рэкламай будзе ажыццяўляць прадпрыемства «Мінскгарафармленне» і Камітэт па патэнтах і інвестыцыях. Але што з усяго гэтага атрымаецца пры такіх падыходах дзяржавы да нацыянальнай спадчыны, да сваёй гісторыі, культуры, сімволікі? Хутка, напэўна, убачым і... заплачам.

СПОРТОБЗОР

Нам Зимбабве не Зимбабве



Владимир Волчков, Максим Мирный, Александр Швец принесли победу белорусской команде над сборной Зимбабве в матче 2-го круга I группы Евро-Африканской зоны Кубка Дэвиса. Несмотря на экзотичность соперника, многим шансы нашей команды казались весьма скромными. Традиции тенниса имеют в Зимбабве очень глубокие корни. Опять же, английская школа. Опасения скептиков нашли свои подтверждения уже в первой встрече В. Волчкова с У. Блэком – при счете 2:3 белорус прекратил встречу из-за травмы. Владимира на корте заменил А. Швец. Но прежде М. Мирный переиграл первую ракетку зимбабвийцев Б. Блэка (6:3,7:5,6:0). Дуэт Мирный–Швец, практически не игравший вместе, в упорной борьбе (7:6 (8:6),5:7 (3:6)5:7 (6:7)) уступил сыгранной паре зимбабвийцев У. Блэк–Уллист.

Таким образом, судьба встреч зависела от двух последних поединков. Даже в большей степени от противостояния А. Швеца и Б. Блэка. Ведь проиграй Александр, счет стал бы 1:3, и встреча М. Мирного с Уиллистом превратилась бы в пустую формальность. Но наши ребята показали настоящий мужской характер, добыв две победы: А. Швец–Б. Блэк (6:4, 7:6, 6:1), М. Мирный–Уиллист (6:3, 7:6, 6:5), и принесли белорусам итоговую победу со счетом 3:2, благодаря чему наша команда сможет выступить в плей-офф за право попадания в первую мировую группу.

Время узнать сильнейшего

8 апреля завершится регулярный чемпионат НХЛ. Президентский кубок достался «Колорадо», который на 7 очков опередил «Детройт» и «Нью-Джерси», набрав 118 очков. Однако сезон в НХЛ не заканчивается. Более того, его кульминация – розыгрыш кубка Стэнли, борьбу за который поведут 16 команд. В 1/8 встретятся: «Нью-Джерси»–«Каролина», «Оттава»–«Торонто», «Вашингтон»–«Питтсбург», «Детройт»–«Лос-Анжелес», «Даллас»–«Эдмонтон», «Сент-Луис»–«Сан-Хосе».

С уверенностью выделить будущего обладателя самого почетного трофея не берется никто. Время показало – это бесполезное занятие. В плей-офф может выиграть любой. Достаточно вспомнить прошлогодний сезон, когда уже в 1/8 занявшие 8 место в конференции «Акулы» переиграли обладателя президентского кубка «Сент-Луис».

Тем не менее, фавориты розыгрыша прежние: «Детройт», «Колорадо», «Нью-Джерси», «Оттава», «Даллас», конкуренцию которым может составить любая команда.

«Магнитка» вновь чемпион

Наш земляк Алексей Калюжный уже во второй раз стал чемпионом России по хоккею. На этот раз в составе магнитогорского «Металлурга» (предыдущий раз он чемпионствовал вместе с московским «Динамо»), который в упорной борьбе сумел переиграть омский «Авангард». Давно уже российское первенство не видело такой красивой и упорной борьбы. Столь велико было стремление игроков к победе, что им порой удавались совершенно фантастические шайбы. Например, форвард «Металлурга» Евгений Корешков забил гол... зубами! В результате же шестиматчевой серии победу со счетом 4:2 одержал магнитогорский «Металлург».

Чемпионат стартовал

Наконец-то начался очередной чемпионат Беларуси по футболу. Разумеется, у специалистов и болельщиков этого вида спорта пока больше вопросов, чем ответов. Вопросы же, как всегда, традиционны: кто станет сильнейшим на этот раз? Все сходятся во мнении, что круг претендентов на золото останется в этом году прежним: мозырьская «Славия», борисовский БАТЭ и минское «Динамо». Вполне возможно, что кто-нибудь, тот же «Шахтер», сумеет вмешаться в их борьбу за медали, но для этого придется сильно постараться. Что же представляют собой прошлогодние призеры в этом сезоне? Это интересует всех еще и потому, что этим клубам летом придется отстаивать честь Беларуси на международной арене.

Наиболее благоприятной представляется ситуация в борисовском клубе. Прежде всего, БАТЭ, за исключением Вадима Скрипченко, сумел сохранить всех своих ведущих игроков. Таким образом, в распоряжении Юрия Пунтуса будет сыгранный на протяжении нескольких сезонов состав, укомплектованный игроками высокого (по белорусским меркам) уровня. Чего стоит хотя бы группа игроков молодежной сборной страны, которые, благодаря выступлениям за национальную команду, приобрели психологию победителей. Это уже не тот детский сад с перспективными игроками, который был в БАТЭ, а команда, способная на высокий результат. Например, выиграть чемпионат Беларуси.

Что касается минских динамовцев, то здесь ситуация неоднозначна. По большому счету, состав команды не изменился, а это значит, сложно ожидать значительных изменений в игре столичного клуба. Учитывая тот факт, что большинство встреч в прошлогоднем сезоне минчане выиграли за счет характера, сложно предположить, как у них сложиться игра в этом году.

Еще неоднозначнее ситуация в стане чемпионов. Ведь неизвестно, что ожидать от команды, которая в межсезонье рассталась с ведущими игроками (Геращенко, Карсаков, Шутов, Денисюк). Вместо них Владо Петрович приобрел четверых соотечественников, игра которых, по крайней мере на кубке Содружества, особого впечатления не произвела. Возможно, они просто не успели влиться в новый коллектив. В любом случае, у «Славии» есть такие форварды, как Стрипейкис и Василюк, которые могут вытянуть любой матч и дать тренеру время на эксперименты с составом.

Подготовил СЕРГЕЙ ВИТАЛЬЕВ

ТЭАТР

Нараджэнне нацыянальнага тэатра

ТАЦЦЯНА ПАЛЯКОВА

Гісторыя пра адхіленне Валерыя Мазынскага ад пасады кіраўніка Тэатра беларускай драматургіі добра вядомая, і не варта яе ў чарговы раз пераказваць. Заўважым толькі, апошнім штуршком для раззлаваных чыноўнікаў з'явіўся прэм'ерны паказ «Прынца Мамабука».

У выніку трупа раскалолася. Тыя, хто пажадаў стаць сапраўды вольным, пайшлі за Мазынскім, каб стварыць новы недзяржаўны тэатр. Пакуль ён паказвае два спектаклі па п'есам Дударава «Прынц Мамабук» і «Вечар».

Калі глядзіш «Мамабука», усёй сваёй істотай адчуваеш: гэта сапраўднае, нашае, беларускае. Наш светапогляд, звычкі, уяўленне аб жыцці. Але чаму ж падняўся ў чыноўных колах такі вэрхал наконт байкі пра візіт афрыканскага караля ў краіну Бусярось? Справа ў тым, што гэтая тэатральная страва трохі паліта палітычным соўсам. Гледачы з задавальненнем пляскаюць у далоні, калі са сцэны гучыць, што пасля сустрэчы з бусяроскім кіраўніком Мамабук з'яўляецца абвешаны канькамі і з клюшкай у руцэ.

Сутрэўшы ў фае тэатра Валерыя Мазынскага, вырашыла скарыстаць момант:

– Мне здаецца, ваш тэатр будзе сапраўды нацыянальным, але ж як вы мяркуеце змагацца за гледача?

–Трэба змагацца добрымі спектаклямі і добрай рэклямай. У нас яшчэ няма на сённяшні дзень прафесійных менеджэраў, якія б умелі падаць спекаткль, няма тэатральнай індустрыі. Разпораз у газетах нешта з'яўляецца. А павінна быць цэлая індустрыя, якая працавала б на тэатральнае мастацтва. У тым ліку і дзяржава павінна паспрыяць развіццю мастацкай культурнай ауры ў сваёй краіне.

–Мяркую, што здабыўшы вольнасць, вы ўжо адчулі моцную залежнасць ад грошай?

–Вы ведаеце, акцёры гатовы і самі яшчэ заплаціць, каб толькі іграць на сцэне. Яны могуць іграць без грошай, але залу глядзельную нам не дадуць без грошай. Касцюмы мы не пашыем за свае 30-40 тысяч, якія атрымліваем.

–Чаму для адной з першых пастановак вы выбралі «Вечар»?

–Гэтая п'еса дагэтуль не састарэла. Яна стала больш страшнай ад таго, што нічога не мяняецца. 20 гадоў таму я ставіў яе пра свайго дзеда, цяпер яна пра майго бацьку, а пройдзе яшчэ 15 гадоў, і яна будзе пра мяне, пра маё пакаленне.

–У гэтаы спектаклі ёсць і іншы пласт: чалавек на парозе смерці, наперадзе невядомы жах.

– Гэта ўвогуле філасофская тэма. Кожны да гэтага краю мусіць падысці. Справа ў тым, з якім рахункам, якім вынікам прыходзім мы да краю жыцця? Страх у тым, што людзі, пражыўшы ўсё сваё жыццё, адыходзяць, не адчуўшы зямнога шчасця. На іх шляху было столькі няшчасцяў, столькі пераломаў, у іх зламаныя, вывіхнутыя лёсы. Іх выкарыстоўвалі як вінцікі, як гайкі. Страх у тым, што яны не разумеюць, наколькі яны няшчасныя. Бацька мой так і адыйшоў, з нішчымніцы ўсё жыццё аддаўшы і не атрымаўшы нават тысячнай долі таго, што напрацаваў. Адзінае, што дзеці засталіся, і я думаю, ён можа спаць спакойна, я адказваю за сваіх братоў, сясцёр. Чалавек мусіць жыць дыхаючы поўнамі груддзямі. Хай ён і будзе памыляцца.

–Хавацца – ці не нацыянальная гэта рыса?

–Гэта стагоддзямі накладзены адбітак. Як пісаў паэт: «З дзвух бакоў айцы дубінай заганялі нас у рай...» Гэта было спрадвеку, білі справа і злева. Але не заўсёды паратунак знаходзяць тыя, што хаваюцца. На шчасце, у нашага народа глыбокія карані.

– Ці няма ў вас намеру зрабіць некалькі вельмі відовішчных спектакляў, каб прывабіць гледачоў і зарабіць грошай?

–Здаецца, «Мамабук» відовішчны. У нас будзе яшчэ камедыя «Чорт і баба» Аляхновіча. Думаем зрабіць і дудараўскую меладраму «Кім». Хаця хочацца рабіць і вельмі тонкія драматычныя спектаклі, як «Вечар». Няхай ніхто не думае, што мы будем ставіць толькі Дударава, ён не зможа пісаць нам кожны год па дзве п'есы (але калі ён будзе пісаць, будзем ставіць). Ёсць у нас на прыкмеце нямецкая сучасная п'еса (мы супрацоўнічаем з Інстытутам Гётэ), і Польскі інстытут з намі хоча мець кантакт. Дарэчы, я з задавальненнем паставіў бы польскую п'есу. Польскі тэатр вельмі цікавы і вельмі моцны. «Салідарнасць» у вялікай ступені выскачыла, скажам так, з тэатра.

–Але ў нас тэарт можа пакуль размаўляць з гледачом толькі эзопавай мовай.

–Страх у пэўнай ступені прысутнічае ў нашай жыццёвай ауры. Нам трэба праз гэта прарвацца. У рэшце рэшт нам мала за што ёсць сябе дакараць, хіба за тое, што мы гаворым, гаворым слаба. Можа, некаторыя рэчы трэба крычаць. Тэатр мусіць умець і крычаць, і гаварыць ціха. Да таго ж хочацца, каб наш тэатр быў сапраўды нацыянальным, нават і па форме. Каб са сцэны гучала ідэальная мова. Каб усе, хто да нас прыходзіць, вучыліся правільна гаварыць па беларуску.

Нашыя акцёры размаўляюць па-беларуску і ў жыцці, па-за сцэнай. Акцёр павінен ганарыцца тым, што ён называецца беларускім акцёрам. Я не люблю падманваць. У жыцці, у мастацтве прагінацца ўжо не хочацца, асабліва калі адчуў асалоду не прагінацца. Я думаю, нашыя акцёры адчуваюць гэтую асалоду. Дай Бог, не прагнемся.

МУЗЫКА

«Твоя любовь» из Могилева

СЕРГЕЙ ПЯТНИЦКИЙ

Вышел новый альбом культовой могилевской команды *"Laus Deo"* под названием "Твоя любовь". Группа играет с 1993 года, в Беларуси и за ее пределами.

Музыка, нетипичная для Беларуси. Дело даже не в том, что музыканты профессиональные. «Laus Deo» – единственная белорусская группа, играющая в стиле пост-панк. Это одно из наиболее интеллектуальных направлений в современной рок-культуре. Грамотно продуманные аранжировки, сдержанно-холодные гитарные партии, дополненные саксофоном и скрипкой.

«Твоя любовь» продолжает традиции «*Cure*», «*U2*», «*Smashing Pumpkins*». Из постсоветских близки «АукцЫон» и, особенно, «Несчастный случай». С Алексеем Кортневым группу сближают тексты.

Концепцию альбома можно выразить строками Саши Башлачева: «*Объясни: я люблю от того, что болит, или это болит от того, что люблю*».

Заказать альбом можно в Могилеве, позвонив по телефону: 0222-42-26-68, и в Минске по телефону: 275-01-54.

Международный фестиваль

В конце апреля в Санкт-Петербурге пройдет международный фестиваль экспериментальной музыки.

С 1998 года единственным проводником такой музыки в бывшем СССР стал фестиваль *SKIF*, который проводится питерским благотворительным фондом Сергея Курехина, выдающегося русского композитора конца XX века. Фонд был основан в 1996 году после его трагической смерти.

Два первых фестиваля, *SKIF*-1 (1997) и SKIF-2 (1998), прошли в Нью-Йорке. В октябре 1998 года в Петербурге прошел *SKIF*-3.

20-22 апреля в городе на Неве во Дворце молодежи состоится уже пятый фестиваль. Во многом он будет не похож на предыдущие. *SKIF-5* станет более мультимедийным. Музыка и театр, перфоманс, акустическая скульптура, компьютерное конструирование – вот неполный список жанров, которые будут представлены на фестивале.

Наряду с академическим авангардом, фри-джазом, прогрессивным роком, будет уделено много внимания так называемой *World music*, в отдельную программу вынесена современная музыка Скандинавии, ожидаются артисты из самых разных уголков мира: Отрадно, что нашлось место и артистам из Беларуси – это группы «Князь Мышкин» и «Драм-экстази». Подробные справки: e-mail: belorg@mail.ru.

Навіны рок-н-ролу

Акцыя, на якой ветэраны айчыннага панку мусілі разаграваць маладыя й блізкія ім па духу каманды, зь цікавасьцю чакалася прыхільнікамі ў менскім клюбе «4 апэльсыны». Але канцэрт «НЕЙРО ДЮБЕЛЯ» не адбыўся. Як паведаміў лідар гурта Аляксандр Кулінковіч, «НЕЙРО ДЮБЕЛЬ» абавязкова сустрэнецца са сваімі слухачамі на адной зь менскіх пляцовак яшчэ да заканчэньня вясны.

Апошнім часам каманда актыўна і з посьпехам канцэртавала па маскоўскіх клюбах, тым ня менш не губляючы шчыльных сувязяў з радзімай. Праца перш за ўсё для менскага слухача – прынцыповая пазыцыя музыкаў. Таму адыграць чарговы канцэрт у Менску – справа гонару для Кулінковіча. Сачыце за абвесткамі.

* * *

17 красавіка ў «4 апэльсынах» адбудзецца хард-рокавы сэйшн. Усе, хто хоць прыкладна чуў аб менскім рок-клюбе, лёгка здагадаюцца: наступіў чарговы дзень народзінаў Рычы Блэкмара.

Як даводзіць нязьменны завадатар фэсту Ўладзімір Зайчанка, гэтая акцыя ня простая – яна юбілейная. Менавіта дваццаць год таму, у часы позьняга застою, маладыя фанаты *DEEP PURPLE* упершыню сабраліся на падпольнае адзначэньне ўгодкаў легендарнага гітарыста. З чайніку гарэлкі зь лімонным лікёрам распачалася традыцыя сьвяткаваньня, якую дагэтуль шануюць як старыкі менскай сцэны, так і хард-рокавая моладзь. За гады існаваньня фэсту на ім перайграла з паўсотні гуртоў, сярод якіх была й такая экзотыка, як «Князь Мышкін» ды «МРОЯ».

У гэтым годзе ў акцыі будуць удзельнічаць *STARGASER*, «Вэртыкальны Ўзьлёт», *MOBY DICK*, «ЭГОИСТ», «ГАЕР», *JEAN'S GUN*. Падтрымка прадзюсэрскага цэнтару «Трактар-бугі», пачатак а 19:00.

* * *

Пасьля двухгадовай паўзы на менскай сцэне выступіць легенда беларускага року, скандальна вядомы гарадзенскі гурт *DEVIATION*. Выступ гарадзенцаў будзе толькі часткай грандыёзнага панк-хардкор штурму, які абрынецца на сцэну шматпакутных «4 апэльсынаў» 20 красавіка.

Акрамя таго, на сцэну выйдзе ня менш легендарная менская каманда пад шыльдай «451°F» (раней вядомая публіцы як *HATE TO STATE*). Калі меркаваць па тым, што каманда іграла раней бескампрамісны краст-панк, відовішча абяцае быць незабыўным.

Наяўнасьць яшчэ аднаго гарадзенскага праекту пад красамоўнай назвай «*KONTRA LA KONTRA*», падобна, канчаткова сьцьвярджае статус Гародні як беларускай Каліфорніі. У кожнай краіне ёсьць рэгіён, які дае фору сталіцы па разьвіцьцю радыкальных музычных і палітычных ідэяў. Для Беларусі такім рэгіёнам становіцца Гародня.

Апошнім цьвіком у труну традыцыйнага грамадзтва стане нямецкі гурт *MORBID RAGE*. Гэты праект пакуль незнаёмы беларускай публіцы, але, мяркуючы па складзе удзельнікаў, можна спадзявацца, што і ён не расчаруе аматараў радыкальнага панку й хардкору. Карацей, падобнага сэйшну даўно не было ў сталіцы.

ПОНЕДЕЛЬНИК, 16 АПРЕЛЯ

13.00, 15.00, 18.00, 23.55 Новости.
13.10 Худ. фильм «Маленькое одолжение».
14.35 Уроки Н.Новожиловой.
15.15 Худ. фильм «Метичара - зверь морской».
16.40 Теленавигатор.
17.00 Сериал «Все мои дети».
18.25 Политические диалоги.
18.50 Зона Икс.
19.05 Комедия «Кое-что о Марте».
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
